ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 27 (1025) ● ЧАЦВЕР, 11 кастрычніка 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXXVIII

## АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

## У РЭКТАРАЦЕ

**Аб перспектывах развіцця нашага універсітэта ішла размова на чарговым пасяджэнні рэктарата. З дакладам па гэтаму пытанню выступіў рэктар БДУ прафесар У. М. Сікорскі. Ён далажыў пра цяперашні стан універсітэцкай матэрыяльнай базы і пра тыя планы, што намечаны да рэалізацыі. У адпаведнасці з імі на ўсіх факультэтах будуць уведзены новыя спецыялізацыі. На базе існуючых навуковых падраздзяленняў (праблемных, галіновых лабараторый, даследчых груп пры кафедрах) будуць створаны ў 1974—1980 гг. навукова-даследчыя інстытуты прыкладной хіміі, прыкладной матэматыкі, геаграфіі, малекулярнай біялогіі і біяфізікі, прыкладной сацыялогіі.**

**На адведзенай спецыяльна для універсітэцкага гарадка новай пляцоўцы ўзнімуцца вучэбна-лабараторны корпус для ФПМ, інстытута прыкладной матэматыкі і вылічальнага цэнтра, вучэбна-лабараторны корпус для біялагічнага факультэта, бібліятэка з чытальнымі заламі на 1000 чалавек і кнігасховішчам больш чым на 2 млн. тамоў. Вырастуць новы комплекс падрыхтоўчага факультэта, вялікі спартыўны комплекс са стадыёнам, закрытым басейнам, гімнастычнымі заламі. Будуць пабудаваны сталовыя, паліклініка, прафілакторый і іншыя аб'екты.**

**Па другому пытанню павесткі дня — аб планаванні аб'ёмаў вучэбных даручэнняў на агульнаўніверсітэцкіх кафедрах і кафедрах гуманітарных факультэтаў — інфармацыю зрабіў прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар С. [illegible]. Умрэйка.**

## ● На чарговым пасяджэнні

кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў заслухана інфармацыя выкладчыка кафедры філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў Ю. А. Гусева аб выніках навуковай камандзіроўкі і абмеркаваны шэраг пытанняў, якія датычаць работы кафедры ў новым навучальным годзе.

Дацэнт Ю. А. Гусеў як стыпендыят ЮНЕСКА на працягу шасці месяцаў стажыраваўся ў Францыі. Ён расказаў аб сваіх сустрэчах з рабочымі Францыі, аб іх жыцці і барацьбе за павелічэнне заработнай платы і паляпшэнне сістэмы сацыяльнага забеспячэння. Няспынная ідэалагічная барацьба прымушае буржуазную дзяржаву рыхтаваць кадры прафесіянальных ідэолагаў. Ю. А. Гусеў расказаў аб метадах уздзеяння буржуазнай прапаганды, аб паклёпніцкай дзейнасці ўсім вядомага Народна-працоўнага саюза. Нягледзячы на тое, што стандарты масавай культуры ўчэпіста трымаюць у сваіх руках абывацеля, моладзь Францыі імкнецца пазнаць праўду пра Савецкі Саюз. Гэта добра адчувалася пры сустрэчах са студэнцкай моладдзю.

Выступленне Ю. А. Гусева было ўважліва выслухана выкладчыкамі і аспірантамі кафедры.

З году ў год у нашай рэспубліцы расце колькасць сацыялагічных даследаванняў. Вялікі ўклад у гэтую работу ўносіць праблемная лабараторыя пры БДУ, якую ўзначальвае кандыдат гістарычных навук І. І. Зубаў. Далейшаму павышэнню якасці апрацоўкі сацыялагічнай інфармацыі былі прысвечаны выступленні І. І. Зубава, А. Б. Лемарэнкі, К. В. Шульгі. Прынята рашэнне прасіць рэктарат аб стварэнні групы матэматычнай апрацоўкі сацыялагічнай інфармацыі пры ВЦ універсітэта, а таксама аб выдзяленні сродкаў для забеспячэння лабараторыі клавішнымі вылічальнымі машынамі.

Пытанням удасканалення новага вучэбнага плана было прысвечана выступленне загадчыка кафедры прафесара Г. П. Давыдзюка. Ва універсітэце сёлета на філасофскім аддзяленні ўводзіцца падрыхтоўка спецыялістаў па прыкладной сацыялогіі, марксісцка-ленінскай этыцы і навуковаму атэізму. Выступіўшыя выкладчыкі кафедры ўнеслі шэраг каштоўных прапаноў па дапрацоўцы спецкурсаў і ўдасканаленню тэматыкі семінарскіх заняткаў.

**А. ЯСКЕВІЧ.**

## У МЯСЦКОМЕ

Заканчваюцца справаздачы і выбары ў пярвічных прафсаюзных арганізацыях выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. У сувязі з тым, што мясцоваму камітэту БДУ прадастаўлены правы райкома прафсаюза, ён сваёй пастановай «Аб правядзенні справаздач і выбараў» перадаў на разгляд прафсаюзным бюро такія пытанні, як размеркаванне пуцёвак у дамы адпачынку і санаторыі, прафілакторыі, турысцкіх пуцёвак і пуцёвак у піянерскія лагеры; аказанне матэрыяльнай дапамогі; расходаванне сродкаў на правядзенне культурна-масавай і масава-фізкультурнай работы; надаў права даваць згоду на звальненне супрацоўнікаў і разгляд працоўных спрэчак.

У кожнай з 23 прафарганізацый выбары прайшлі арганізавана, з вялікай актыўнасцю членаў прафсаюза. У склад прафбюро выбрана 228 чалавек, у склад рэвізійных камісій — 54 чалавекі. Старшынямі прафбюро выбраны старшыя выкладчыкі Э. Е. Радоўскі (фізфак), В. І. Карзюк (ФПМ), М. А. Гарбар (юрфак), І. І. Сачанка (журфак); дацэнты І. К. Караленка (кафедры грамадскіх навук), В. П. Красней (філфак), Э. М. Загарульскі (гістфак), М. П. Гілевіч (хімфак), А. В. Канстанцінаў (біяфак) і іншыя.

**Д. САКОВІЧ,**
**намеснік старшыні мясцкома.**

## УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

### Аб узнагароджанні тав. СІКОРСКАГА У. М. Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР

За заслугі ў падрыхтоўцы кадраў, актыўную навукова-педагагічную дзейнасць і ў сувязі з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння ўзнагародзіць рэктара Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга універсітэта імя У. І. Леніна члена-карэспандэнта Акадэміі навук Беларускай ССР тав. Сікорскага Усевалада Міхайлавіча Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР**
**Ф. СУРГАНАЎ.**

**Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР**
**Л. ЧАГІНА.**

9 кастрычніка 1973 года. Гор. Мінск.

## ЗАЦВЕРДЖАНЫ

**ў вучоным званні дацэнта:**

АЛЯХНОВІЧ Галіна Іванаўна (кафедра палітэканоміі);

ІЛЬЮЦІК Леанід Максімавіч (кафедра палітэканоміі);

КВОЧКІН Міхаіл Паўлавіч (кафедра навуковага камунізму);

ВАДЗЕЙКА Рэм Іосіфавіч (кафедра педагогікі і псіхалогіі).

## НА КАФЕДРАХ І Ў ЛАБАРАТОРЫЯХ

## ● Пачала работу

кафедра лічбавых метадаў і праграміравання. Асноўная вучэбная нагрузка яе звязана з чытаннем на старэйшых курсах дысцыплін: метады прыбліжаных вылічэнняў, вылічальныя машыны і праграміраванне (на дзённым аддзяленні); метады прыбліжаных вылічэнняў, вылічальная матэматыка і праграміраванне, уводзіны ў матэматычнае забеспячэнне ЭВМ (на вячэрнім аддзяленні факультэта). Выкладчыкі кафедры будуць весці таксама практычныя і лабараторныя заняткі па гэтых дысцыплінах, кіраваць вучэбнай і вытворчай практыкай студэнтаў.

Неабходнасць арганізацыі такой кафедры была абумоўлена спецыфікай матэматычнай адукацыі, глыбокім пранікненнем матэматыкі ў розныя галіны навукі і тэхнікі і тым, што такое пранікненне ўсё часцей здзяйсняецца з дапамогай вылічальных машын.

Навуковыя інтарэсы калектыву вызначаюцца пытаннямі тэорыі лічбавых метадаў для рашэння дыферэнцыяльных і інтэгральных ураўненняў, стварэння і ўдасканалення пакетаў праграм для рашэння тыпавых задач матэматыкі.

Дыпломныя і курсавыя работы студэнтаў, якія спецыялізуюцца па нашай кафедры, будуць па зместу прымыкаць, у асноўным, да гэтых двух напрамкаў.

Падрыхтоўка і выхаванне сучаснага спецыяліста, у прыватнасці матэматыка, могуць быць здзейснены толькі пры добрай пастаноўцы вучэбнай, навуковай, ідэйна-палітычнай і выхаваўчай работы. На гэта і накіраваны асноўныя намаганні калектыву новай кафедры.

**П. МАНАСТЫРНЫ,**
**в. а. загадчыка кафедры лічбавых метадаў і праграміравання, дацэнт.**

* * *

— З чым прыйшла да новага навучальнага года кафедра матэматычнага забеспячэння ЭВМ факультэта прыкладной матэматыкі?

З гэтым пытаннем наш карэспандэнт звярнуўся да загадчыка кафедры Віктара Георгіевіча Карпава.

**— Яшчэ ў мінулым годзе ад нашай кафедры аддзялілася кафедра агульнага праграміравання, і мы набылі самастойнасць.**

**Асноўны навуковы кірунак нашай работы: машыннае праектаванне шырокага класа схем (лагічных, электронных, цеплавых, аптычных і г. д.) Калі мінулы год быў годам пошукаў, то цяпер многае вызначылася больш пэўна. Сёлета мы ўводзім 16 новых спецкурсаў, самым цікавым з якіх з'яўляецца курс праектавання праграм. Ён дазваляе прасачыць шлях ад задумы да рэалізацыі яе на машыне.**

**Такое мноства курсаў, якія распрацоўваюцца ўноў, стварае, вядома, і цяжкасці. Супрацоўнікі кафедры — ў асноўным моладзь, выпускнікі універсітэта. У іх пакуль не хапае вопыту, але ёсць жаданне працаваць, а гэта — галоўнае.**

# ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА

### ПАЛІТІНФАРМАЦЫЙ І ГУТАРАК СЯРОД СТУДЭНТАЎ НА ПЕРШЫ СЕМЕСТР 1973—1974 ГОДА

◆ *Пытанні палітычнага і эканамічнага жыцця*

Правядзенне палітінфармацый па важнейшых падзеях палітычнага, эканамічнага жыцця унутры краіны, рэспублікі і за мяжой (2 разы ў месяц).

Рост матэрыяльнага дабрабыту і культурнага ўзроўню савецкага народа — важнейшая мэта палітыкі КПСС.

Матэрыяльна-тэхнічная база развітага сацыялізму.

Нацыянальны даход у дзевятай пяцігодцы.

Сацыялістычнае спаборніцтва як грамадскія адносіны.

◆ *Пытанні камуністычнага выхавання*

XXIV з'езд КПСС аб узрастанні ролі маральнага пачатку ў развітым сацыялістычным грамадстве.

Камуністычная мараль аб маральнай свабодзе, свядомай дысцыпліне і адказнасці асобы.

Усесаюзная канферэнцыя «У. І. Ленін і моладзь».

Нараджэнне ленінскай партыі. (Да 70-годдзя II з'езда РСДРП).

Маральная дэградацыя сучаснага буржуазнага грамадства.

◆ *Пытанні міжнароднага жыцця*

Умацаванне пазіцый сусветнага сацыялізму, развіццё ўсебаковага супрацоўніцтва з брацкімі краінамі — важнейшы напрамак знешнепалітычнай дзейнасці КПСС і Савецкай дзяржавы.

СССР — ЗША: паварот да ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

Антымарксісцкая сутнасць тэорыі і практыкі мааізму.

Міжнароднае значэнне праблемы разззбраення.

Важнейшыя міжнародныя праблемы Лацінскай Амерыкі.

Спецкурс па беларускай мове вядзе ў пяцікурснікаў-вячэрнікаў прафесар Л. М. Шакун.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.





# СТУДЭНЦКІ СТАРТ

## СПАДАРОЖНАГА ВЕТРУ!

Навучальны год набірае тэмп. Што ні дзень, то новыя і цікавыя ўражанні, якімі вельмі хочацца падзяліцца з сябрамі. У час перапынкаў хлопцы і дзяўчаты, першакурснікі, збіраюцца ў калідоры групамі, і льецца гутарка.

Падыходжу да адной такой групкі. Знаёмімся. Наташа Парахоўнік, Пётр Майтак — студэнты першага курса юрфака, Аляксандр Шчэрбін—журфакавец.

— Скажыце, якім вы ўяўлялі сабе студэнта перад паступленнем?

**А. Шчэрбін:** — Сумленным, праўдзівым, працавітым.

**П. Майтак:** — Ён жыццялюб, які ўпэўнена ідзе да сваёй мэты.

**Н. Парахоўнік:**—І не толькі. Мне ён уяўляўся чалавекам, які імкнецца ведаць усё. Ён усюды: на стадыёне, у тэатры, на будоўлі. Ён—аптыміст.

— І як, вашы ўяўленні пацвердзіліся?

**Н. Парахоўнік:** — Так, і я вельмі ганаруся, што мне пашанцавала быць членам гэтай дружнай сям'і.

— Што далі вам першыя дні знаходжання ва універсітэце?

**П. Майтак:**—Хутчэй за ўсё, яны адабралі вольны час. Хочацца ўсё ведаць, усюды паспець. А як?

**А. Шчэрбін:** — Я пазнаёміўся з цудоўнымі выкладчыкамі. А колькі цікавага даведваешся на занятках! І калі мець на ўвазе тое, колькі яшчэ прыйдзецца пачуць, дык адчуваеш баязлівасць і нейкую няўпэўненасць у сваіх сілах. Як утрымаць усё ў памяці? Гляджу на студэнтаў старэйшых курсаў і здзіўляюся: як яны ў свой час змаглі ўсё гэта засвоіць і як спраўляюцца зараз?

— Напэўна, вам патрэбна іх дапамога?

**П. Майтак:** — Так, хацелася б пагутарыць з імі пра многае. Напрыклад, як яны арганізуюць свой працоўны дзень, якімі падручнікамі лепш карыстацца, як засвоіць столькі інфармацыі?

**Н. Парахоўнік:** — Па-мойму, трэба запрашаць на групавыя сходы студэнтаў старэйшых курсаў і ў першую чаргу выдатнікаў. Хай раскажуць, параяць!

— Дзякуй за размову. І ў заключэнне: дзе б вам хацелася працаваць пасля заканчэння універсітэта?

**П. Майтак:**—Хацелася б у пракуратуры.

**Н. Парахоўнік:** — Стаць бы суддзёй...

**А. Шчэрбін:** — А я—у раёнку. Колькі там работы!

— Дык што ж, спадарожнага ветру табе, першакурснік!

**Г. АКІМОВІЧ.**

## ВОСЕНЬСКІЯ РАНІЦЫ

*(або некалькі шчырых слоў пра першакурснікаў-біёлагаў.)*

Ці заўважалі вы калі-небудзь прыгажосць, хараство, непаўторнасць восеньскіх раніц? Іх свежы подых, лёгкую асалоду ад удыхаемага паветра.

Ці спыняліся вы аднойчы перад уваходам у корпус, застыўшы ў радасным здзіўленні — насупраць нечакана, за адну ноч узнялася моцная сцяна з старадаўняй пазалотай?!

«Звычайныя раніцы, звычайная восень, звычайныя пажаўцелыя дрэвы»,— здагадліва растлумачыце вы. І, напэўна, не ўспомніце сваёй першай вераснёўскай студэнцкай раніцы, таго незабыўнага хвалявання, з якім вы падніmaліся на «свой» паверх, тых месяцаў, калі аб вас крышачку звысоку, але і ласкава адзываліся: «першакурснікі». Усё гэта для вас далёкае мінулае, а вось для першакурснікаў-біёлагаў першыя месяцы ва універсітэце... Але паслухаем лепш іх галасы:

— Першыя дні неяк нязвыкла сябе адчуваеш. Падымаешся на шосты паверх: шум, гам, рознагалоссе. Адзін другому нешта растлумачваюць; хтосьці вырашае спрэчныя пытанні... А цябе гэта неяк не закранае. Але... праходзяць дні, і ты адчуваеш, што ранейшая адзінота знікае. На змену прыходзяць знаёмствы з аднакурснікамі, выкладчыкамі, факультэтам. І аднойчы, нечакана, у табе нараджаецца студэнт,— дзеліцца сваімі думкамі стараста курса Сяргей Львоў.

А вось Саша Філіч зрабіў (зусім самастойна) «даросль» і важны вывад:

— Шчыра кажучы, студэнцкае жыццё ўяўляў некалькі па-іншаму. Цяпер бачу: у вну немагчыма паспяхова займацца без штодзённай мэтанакіраванай працы над вучэбнымі дапаможнікамі, канспектамі, першакрыніцамі.

Для «старых» яны — пакуль проста першакурснікі, а паміж сабой — ужо даўно Колі, Наташы, Сяргеі... Пазнаёміліся, пасябравалі.

— І здорава дапамагла нам у згуртаванні калектыву праца на бульбе,— аднадушна лічаць студэнты. Гэта ж і была, на думку камсорга Анатоля Чумака, тая агульная жывая справа, якая заахвоціла рабят, зацікавіла, праверыла, хто ёсць хто.

Вось тут і праявіліся арганізатарскія здольнасці кожнага. Ужо з першых дзён рэдкалегія ў складзе Сашы Філіча, Віталя Тараса, Яўгена Блудава пачала выпускаць «маланкі». І, па шчыраму прызнанню Сярожы Львова, прыемна было пасля працоўнага дня ісці дамоў, дзе цябе чакаў цудоўны вечар з песнямі, кіно, сябрамі.

Вось так і нараджаецца калектыў, некаторыя рысы якога складваліся яшчэ ў час уступных экзаменаў. Цяпер галоўнае — не перастаць здзіўляцца прыгажосці раніцы, хараству паркаў, нечаму новаму і цікаваму ў жыцці.

...Ці адчувалі вы, што восенню паветра напоена нечым асаблівым?

Ці не прыгадвалася вам калі-нікалі ў хвіліны светлага суму, што першыя студэнцкія восеньскія раніцы бываюць у жыцці толькі аднойчы...

**Т. СКІБІЦКАЯ.**

## ВОСЬ МЫ НА ГОД І ПАСТАЛЕЛІ

— Дзяўчаты, дзе наша аўдыторыя? Я абегала ўсе паверхі...

— ...А адносна матаналізу ў мяне такія думкі: грызці, грызці яго, каб іскры ляцелі, каб зразумець, каб не быць нулём.

— ... Са сваёй першай стыпендыі я паслала ў школу тэлеграму, павіншавала з Днём настаўніка. Бо дзякуючы працы настаўнікаў я і вучуся тут.

— А я яшчэ не веру, што ўжо студэнт. Але, тым не менш, з'яўляецца сум, калі я ўспамінаю школу. Там табе ўсё «разжуюць», у рот «пакладуць» і яшчэ і «праглынуць» прымусяць, а тут...

Гэтыя выказванні належаць студэнтам, якія і сталі студэнтамі ўсяго толькі паўтара месяца назад. Так, вы здагадаліся, размова ідзе аб першакурсніках, аб тых, для каго і лекцыі, і доўгія чэргі ля гардэроба, і гэтая цудоўная студэнцкая восень — усё ўпершыню.

Зойдзем на факультэт прыкладной матэматыкі. Сваімі ўражаннямі аб першым дні вучобы дзеліцца А. Віхіраў (ІІ група):

— Першы самастойны крок я ўжо зрабіў, калі здаў уступныя экзамены. Цяпер галоўнае — не аступіцца, не ўпасці. Першая лекцыя? Усё незвычайна, нова. Умяшчальная аўдыторыя, навокал сур'ёзныя, засяроджаныя твары. На першага выкладчыка глядзелі як на бога.

У размову ўступае А. Лазоўскі (ІІ група):

— У школе нас палохалі тым, як чытаюць лекцыі. Але першая лекцыя мне спадабалася. Па крайняй меры, я ўсё зразумеў і менавіта таму пранікнуўся павагай да першага выкладчыка — Г. А. Драбушэвіча.

— А чаму ты выбраў паміж матфакам і ФПМ у карысць апошняга?

— Адказаць нялёгка. Я люблю нешта практычнае, я б сказаў, прыкметнае. У цяперашні момант ЭВМ для мяне — гэта ўсё. Можа быць, гэта моцна сказана. Таму што чалавек не можа абмяжоўвацца працай...

— і ўхіляцца ад грамадскага жыцця свайго калектыву.

— Так. Што датычыцца калектыву, то ён у нас пачаў складвацца яшчэ на бульбе, — С. Тышкевіч (І група) успамінае гасцінную вёсачку, дзе будучыя матэматыкі пералічылі ўсё, у тым ліку слівы і яблыкі.

— Бульба!—твар А. Лазоўскага святлее. — Цяпер успамінаеш аб гэтым з пачуццём чагосьці вельмі добрага. Здаецца, нічога лепшага яшчэ не было. Заробленыя грошы? Я пра іх і не думаў. Пры чым тут грошы, калі мы на бульбе так зблізіліся, пазналі адзін аднаго, пасябравалі.

Што ж, гэта вельмі добра, калі ўжо на першым курсе можна сказаць: рабяты добрыя, калектыў атрымаўся. Застаецца пажадаць першакурснікам сапраўднай дружбы і поспехаў!

**С. ШЫДЛОЎСКАЯ.**

## КУРАТАР І ЯГО ГРУПА

Новае папаўненне гістарычнага факультэта — у асноўным учарашнія школьнікі. Вялікія цяжкасці ім прыйдзецца перадолець, перш чым яны ўвойдуць у правільнае рэчышча студэнцкага жыцця. Асіліць гэтыя цяжкасці ім дапамогуць і камсамольская, і прафсаюзная арганізацыі, выкладчыкі факультэта і, канешне, куратар.

Быць куратарам, асабліва на першым курсе, вельмі адказна і, разам з тым, вельмі складана. Куратару і групе прадстаіць працаваць поплеч пяць гадоў. А аснова поспеху гэтай работы павінна быць закладзена на першым курсе.

Мне хацелася б крышку расказаць аб рабоце куратараў першага курса аддзялення гісторыі (цяперашняга II курса). Мы, а нас чатыры куратары працавала на першым курсе, вельмі хваляваліся, калі ішлі на першую сустрэчу са студэнтамі сваёй групы. Вельмі хацелася, каб навічкі палюбілі наш факультэт, які славіцца цудоўнымі традыцыямі.

Ва ўсіх групах мы правялі гутаркі аб гісторыі факультэта, расказалі аб выкладчыках, якія працавалі і працуюць тут, паказалі музей, кабінеты, дзе ім прадстаіць рыхтавацца да заняткаў.

Вучоба — вось на што была перш за ўсё звернута ўвага куратараў. У час сустрэч са студэнтамі давалі парады: як працаваць над кнігай, як пісаць канспект лекцый і практычных заняткаў, як правільна пабудаваць рэжым дня і інш. Мы часта наведвалі практычныя заняткі ў сваіх групах, цікавіліся ў выкладчыкаў паспяховасцю сваіх рабят.

У першы год навучання было праведзена шмат культурна-масавых мерапрыемстваў, і куратар быў абавязковым іх удзельнікам.

Апорай куратара з'яўляецца групавы «трохвугольнік» — стараста, камсорг, прафорг. Большасць з іх спалучае выдатную вучобу з актыўнай грамадскай работай. Гэта С. Маслоўскі, Н. Шэйда, Н. Лукашэвіч, Ю. Блашкоў і іншыя.

Вялікую работу ў сваіх групах праводзяць куратары Ядзвіга Паўлаўна Навуменка і Жана Барысаўна Чэпа. Яны часта наведваюць інтэрнат, бываюць і на кватэрах, дзе жывуць студэнты іх групы, праводзяць індывідуальныя гутаркі, абавязкова ўдзельнічаюць ва ўсіх камсамольскіх, прафсаюзных сходах і палітінфармацыях.

Але, канешне, не заўсёды ішло ўсё гладка ў групе: былі і пропускі, былі і двойкі, былі і вымовы. Таму і куратару, і яго памочніку — групавому «трохвугольніку» — неабходна быць заўсёды напагатове, каб своечасова папярэдзіць непрыемнасці.

Хочацца пажадаць усім куратарам, асабліва куратарам першых курсаў, вялікіх поспехаў у іх вельмі адказнай рабоце па выхаванню студэнцкай моладзі.

**Л. СУШКЕВІЧ,**
**выкладчыца гістфака.**








## САМЫ ПЕРШЫ, САМЫ ЦУДОЎНЫ!

**З ранку на геаграфічным факультэце пануе святочнае ажыўленне: сёння Геафакія прымае новых жыхароў, сёння 136 першакурснікаў прысягнуць на вернасць студэнцкаму жыццю.**

**У прасторнай аўдыторыі сабраўся ўвесь факультэт. Горача вітаюць віноўнікаў урачыстасці. Затым сакратар камітэта камсамола Віктар Раманаў здае рапарт дэкану М. Т. Раманоўскаму аб гатоўнасці да адкрыцця свята.**

**Слова бярэ Мікалай Тарасавіч Раманоўскі. Ён віншуе былых абітурыентаў з важнай падзеяй у жыцці, заклікае з гонарам несці высокае званне студэнта БДУ, захоўваць вернасць факультэту.**

**Урачыста аб'яўляецца аб прыняцці першакурснікаў у студэнцкае асяроддзе.**

**(Заканчэнне на 4-й стар.).**



## ТРЭЦІ ПРАЦОЎНЫ — ТРЭЦЯМУ, РАШАЮЧАМУ

**Лета-73. Якім яно было для нас? Што новага прынёс працоўны семестр? Чым вымяраецца студэнцкі ўклад? Такія пытанні абмяркоўваюцца зараз у факультэцкіх камітэтах камсамола. Мне ж хочацца падзяліцца (з тымі, каму не пашанцавала пабываць у будаўнічым атрадзе), уражаннямі ад паездкі з СБА «Феміда-1», а з былымі ўдзельнікамі студэнцкіх новабудоўляў абмеркаваць некаторыя праблемы.**

**Дык вось тры працоўныя дні атрада «Феміда-1».**

# ЗАПАЛІ АГОНЬ ДУШЫ

**Дзень першы**

«Паважаныя таварышы! Да нас прыбыў поезд з пасланцамі слаўнай Беларусі. Сардэчна віншуем вас, сыны Белай Русі! Хай казахстанская зямля стане вам другім домам!».

Прыемны, цёплы жаночы голас змоўк.

— Вы ў саўгас імя Батурына?

— Э, не! Гэта мае, чапаеўцы,—адсунуў ад нас жвавага «купца» парторг будаўнічай арганізацыі, у якой мы павінны былі працаваць. — За мной, хлопцы!

Потым былі ўрачыстая лінейка, словы прывітання, кветкі... І зноў дарога, дарога. Па-над стэпам павіс вячэрні змрок, але зморанасці ніхто не адчуваў. Хлопцы скупіліся на задніх сядзеннях аўтобуса і ўсе 120 кіламетраў, якія аддзяляюць Уральск ад Чапаева, спявалі песні так моцна, што шафёр у здзіўленні раз-пораз круціў галавой. Нарэшце, калі ўсе асіплі, аўтамабільныя фары асвяцілі вялізны шчыт з надпісам: «г. Чапаеў».

***

Называць горадам яго пачалі толькі год назад. Насельніцтва складаюць у асноўным казахі. Аднак, як відаць, у Казахстане больш, чым у любой іншай рэспубліцы нашай краіны, адчуваеш дружнае дыханне інтэрнацыянальнай сям'і. Рускія і беларусы, украінцы і татары, што жывуць тут,—усе роўныя сярод роўных, і ўсіх радніць вялікая павага да гераічнага мінулага гэтых мясцін, авеяных нязгаснай славай героя грамадзянскай вайны Васіля Іванавіча Чапаева. І жвавыя хлапчукі, якія з азартам гуляюць «у Чапая», і абеліскі, і музей—усё нясе на сабе пячатку светлай памяці, любві і павагі.

Мы хадзілі па гораду. Доўга ва ўрачыстым маўчанні стаялі на беразе Урала. Тут загінуў Чапаеў. Рака, нібы спалохаўшыся дакорлівых позіркаў ці, не жадаючы напамінаць сабе аб трагічным, аднойчы не дайшла да гэтага месца і ціха звярнула ўправа. Пад крутым абрывам спакойна застыла абмялеўшае рэчышча, і толькі па вышыні берагоў можна меркаваць, якой шырокай і бурнай была тут плынь. Людзі паставілі на беразе абеліск — гіганцкі стальны штык.

Мы ціха ідзем па вуліцы, дзе паміж саманных дамоў растуць цагляныя будынкі, адчуваем выпрабавальныя позіркі прахожых, і, мусіць, кожнаму падумалася: «Жыць і працаваць у горадзе Чапаева—вялікі гонар. Мы павінны апраўдаць давер'е».

***

— Пад'ём!

Гэта значыць, што працоўны семестр пачаўся, што нашы мары здзейсніліся. Але...

— Шэсць гадзін! — з жахам крычыць Славік Рубцоў.

— А па нашаму, беларускаму,—чатыры, — удакладняе хтосьці.

— Эх, у нас у вёсцы яшчэ танцы гудуць!.. — салодка пазяхае Міхась Сушко.

Але голас камандзіра падымае ўсіх.

Таня Чараднічэнка прыкметна хвалюецца. Сёння ж першае снеданне, прыгатаванае ёю на казахскай зямлі! Ці спадабаецца хлопцам?..

***

Вось ён, трохпавярховы будынак. Гэта бальніца на 1200 ложкаў. Тут нам працаваць. А зрабіць прыйдзецца шмат. Будынак нагадвае зараз цагляны касцяк. Наша задача — дабудаваць бальніцу: зрабіць тынкоўку, падлогу, вокны, дзверы, страху. Але раптам высвятляецца, што будаўнічая арганізацыя не мае патрэбных матэрыялаў. Няма аконных блокаў, керамзіту, шклоўаты.

— Падвязуць, — супакойвае начальнік ПМК.

Пакуль што мы пачалі рыхтаваць памяшканні пад насціл падлогі. І ўсё ж цікава: дзе будматэрыялы? Чаму кіраўнікі ПМК, падаўшы заяўку на будаўнічы атрад, своечасова не паклапаціліся аб гэтым? Вядома, зараз, калі пачалі работу многія атрады, гэтыя матэрыялы на базе не заляжацца. Напэўна, пры заключэнні дагавораў штабы павінны патрабаваць уключыць у іх такі пункт, як наяўнасць будматэрыялаў к пачатку работ. А камандзірам атрадаў трэба датэрмінова выязджаць на аб'екты, каб прыняць у падрыхтоўчай рабоце самы актыўны ўдзел.

...Аднак першыя няўвязкі не зламалі нашай упартасці і не сапсавалі пачатак працоўнага семестра.

Туды-сюды ходзяць хлопцы з насілкамі, ухкаюць трамбоўкі, а там, дзе канчаецца канал каналізацыі, чуецца дружны звон рыдлёвак. Дзяўчаты быццам згаварыліся, вырашылі, відаць, даказаць, што яны зусім не слабая палова чалавецтва: ухапіліся за насілкі і пільна сочаць, каб насыпалі пяску столькі ж, колькі і ў насілкі хлопцаў.

Усіх захапіў працоўны рытм. Рабілі сваю справу прагна, хутка, забыўшыся пра час, і калі Алег Танкевіч на высокай ноце пракрычаў: «Абед, абед!»,— здзівіліся: «Ну і час ідзе!»

Праз гадзіну зноў былі ўсе ў рабоце. Сонца, нібы зацікаўленае незвычайным рухам каля пустога дагэтуль будынка, павісла насупраць вокан і нястомна паліла голыя спіны, рукі, шыі. Потым, падзівіўшыся на працу сваіх праменняў, хутка пакацілася долу.

Працоўны дзень скончыўся. Балелі рукі, спіна, але ўсе былі задаволены, што ёсць пачатак вялікай справы, што твае маладыя рукі патрэбны людзям.

**Г. МАРОЗАЎ,**
**студэнт.**

**(Працяг будзе).**



*СПРАВЫ ІНТЭРНАЦКІЯ*

## КАБ ПЛАНАМ АЖЫЦЦЯВІЦЦА

Партыйная арганізацыя матэматычнага факультэта значную ўвагу ўдзяляе выхаваўчай рабоце са студэнтамі. Адно з яе звенняў — гэта работа ў інтэрнаце. Ад таго, які наш дом, як у ім праводзяць час студэнты, што іх цікавіць, — залежыць многае.

Партбюро факультэта неаднаразова абмяркоўвала стан спраў у інтэрнаце, былі прыняты рашэнні, якія дапамагалі своечасова выправіць выяўленыя недахопы. У выніку у інтэрнаце палепшылася наглядная агітацыя, створан і праводзіць работу «Клуб цікавых сустрэч». Адбыліся вечары, прысвечаныя знамянальным датам, сустрэчы з ветэранамі, удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны.

Важнае месца ў рабоце клуба займаюць пытанні інтэрнацыянальнага выхавання. Сумесна з дэканатам па навучанню замежных студэнтаў праведзен вечар пад назвай «Рускі чай», адбылася гутарка аб Індыі. Дацэнт факультэта В. Н. Русак расказаў аб сваіх уражаннях ад паездкі на Кубу. Шмат разнастайных і цікавых пытанняў было зададзена на вечары пытанняў і адказаў па міжнародных праблемах. Хвалююць нашых студэнтаў пытанні культуры паводзін, праблемы сучаснай сям'і.

Вялікія планы намечаны і на сёлетні навучальны год. Тут і сустрэчы з дзеячамі навукі і культуры, канцэрты мастацкай самадзейнасці і шмат іншага. Распрацавана палажэнне аб конкурсе на лепшы пакой, лепшы паверх.

Аднак каб усе планы былі выкананы, неабходны самы актыўны ўдзел кожнага студэнта. Партыйнае бюро матэматычнага факультэта лічыць галоўнай задачай: узняць актыўнасць студэнтаў, прыцягнуць і накіраваць маладыя сілы і таленты на выкананне тых задум, што намечаны ў плане работы выхаваўчай камісіі ў інтэрнаце.

**В. ПРОКАШАВА,**
**адказная за работу ў інтэрнаце.**

## АТРЫМАЛІ СПАГНАННІ

**Прадстаўнікі дэканата, партбюро і камітэта камсамола фізічнага факультэта правялі нядаўна праверку санітарнага стану і выканання студэнтамі правіл пражывання ў інтэрнаце № 7.**

**У пакоях №№ 1316, 1112, 1210 было выяўлена шмат бутэлек з-пад спіртных напіткаў. Усюды — бруд, з лямпачак зняты плафоны, парушана электраправодка. У некаторых пакоях начавалі пабочныя асобы.**

**Загадам рэктара за ўтрыманне пакояў у антысанітарным стане, сістэматычныя выпіўкі і парушэнне правіл пражывання ў інтэрнаце выселены з яго: В. Цітавец (II курс), Л. Фёдарава (IV), А. Александровіч (V), А. Вайцюк (V), А. Ярмоленка (V).**

**Аб'яўлена вымова М. Сільвановічу (III курс), А. Ермаковічу (IV), У. Міклашэвічу (IV), А. Кажэнаву (V), М. Касцюкевічу (V), А. Прыхачу (V), В. Сафронаву (V), А. Сафронаву (V).**

**ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ**

## «ДОМ БЕЗ ГАСПАДАРА»

Пад такім загалоўкам у № 24 нашай газеты за 20 верасня 1973 года быў апублікаван артыкул, у якім гаварылася аб дрэннай падрыхтоўцы інтэрнатаў № 5 і № 3 да новага навучальнага года.

Нядаўна рэдакцыя атрымала адказ ад прарэктара па гаспадарчай рабоце. У ім гаворыцца: «Праверкай устаноўлена, што факты, прыведзеныя ў артыкуле аб недахопах у інтэрнаце № 5, — пацвердзіліся.

Недахопы ўзніклі ў сувязі з тым, што камендант інтэрната № 5. І. Ф. Яшкін доўгі час знаходзіўся ў бальніцы. У цяперашні час недахопы ліквідаваны: зашклёны вокны, у пакоях пастаўлены дзвярныя ручкі, выкананы мулярныя работы».

# ПАЛАЖЭННЕ

## АБ КОНКУРСЕ НА ЛЕПШУЮ ГРУПУ

### *Мэта і задачы*

Конкурс на лепшую студэнцкую групу праводзіцца пад дэвізам «Вучыцца, працаваць і жыць па-камуністычнаму».

Асноўная мэта конкурсу—выхаванне ў студэнтаў сумленных, творчых адносін да вучобы, згуртаванне калектываў студэнцкіх груп на аснове выканання маральнага кодэксу будаўніка камунізму.

Задачы конкурсу — павышэнне ўзроўню ведаў шляхам арганізацыі сістэматычнай, самастойнай творчай работы і шырокага ўдзелу ў навуковых даследаваннях, актыўнае прыцягненне студэнтаў да грамадска-палітычнага і спартыўнага жыцця універсітэта, павышэнне культурнага ўзроўню студэнтаў, арганізацыя змястоўнага, цікавага адпачынку і паляпшэнне быту.

### *Парадак правядзення*

Конкурс паміж групамі праводзіцца ў два этапы з падвядзеннем вынікаў па кожнаму з іх.

Устанаўліваюцца наступныя тэрміны падвядзення вынікаў:

Вынікі першага этапа (1 верасня 1973 года — 1 сакавіка 1974 года) падводзяцца з 1 па 15 сакавіка 1974 года. Вынікі другога этапа (1 сакавіка 1974 года — 1 верасня 1974 года) падводзяцца з 15 па 30 кастрычніка 1974 года.

Для падвядзення вынікаў на кожным факультэце ствараецца конкурсная камісія ў саставе: члены прафбюро і камітэта камсамола, прадстаўнікі дэканатаў і вучэбных груп.

Прадстаўленне лепшых груп (па адной ад кожнага факультэта) здзяйсняецца конкурснай камісіяй факультэта з улікам рашэнняў вучэбных камісій.

У састаў конкурснай камісіі універсітэта ўваходзяць: члены прафкома і камітэта ЛКСМБ, а таксама прадстаўнікі факультэцкіх конкурсных камісій.

Конкурсная камісія універсітэта вызначае лепшую групу па выніках этапаў.

### *Выніковыя паказчыкі*

Пры вызначэнні лепшай групы ўлічваюцца: паспяховасць, дысцыпліна, навукова-даследчая работа, удзел у грамадскім жыцці, спорце, працоўным семестры.

1. ПАСПЯХОВАСЦЬ.

Выводзіцца сярэдні бал групы па адзнаках, атрыманых на экзаменах. Для гэтага сумірующца ўсе першыя экзаменацыйныя адзнакі (адзнакі пераздачы экзаменаў не ўлічваюцца). Гэтая сума дзеліцца на колькасць студэнтаў у групе. (Выдатна — 5 балаў, добра — 4 балы, здавальняюча — 3 балы, нездавальняюча — 0 балаў).

2. НАВУКОВАЯ РАБОТА

Даследчая работа I катэгорыі — 5 балаў, II — 4 балы, III — 3 балы. Удзел у рэспубліканскіх і універсітэцкіх конкурсах — 1 бал, 100-працэнтны ўдзел групы ў СНТ — 3 балы, Х-працэнтны — адпаведная колькасць балаў. Сумірующца ўсе балы і дзеляцца на колькасць студэнтаў у групе. (Выкананне студэнтамі курсавых работ не ўлічваецца).

3. ГРАМАДСКАЯ РАБОТА

100 працэнтаў студэнтаў удзельнічаюць у грамадскай рабоце — 5 балаў, Х працэнтаў — адпаведная колькасць балаў. Улічваецца, што студэнт займаецца грамадскай работай, калі ён: а) удзельнічае ў рабоце грамадскіх студэнцкіх органаў курса, факультэта, універсітэта і г. д.; б) сістэматычна выконвае грамадскія даручэнні. Іншыя віды грамадскай работы ўлічваюцца па ўгледжанню камісіі.

4. СПОРТ

Студэнт, які выступае за універсітэт у адным з відаў спорту, атрымлівае тры балы, за факультэт — 2 балы. У залік ідуць балы не больш чым па двух відах спорту ў аднаго і таго ж спартсмена. Удзел у агульнауніверсітэцкіх кросах не ўлічваецца. Сума атрыманых балаў дзеліцца на колькасць студэнтаў у групе.

5. МАСТАЦКАЯ САМАДЗЕЙНАСЦЬ

Студэнт, які ўдзельнічае ў мастацкай самадзейнасці універсітэта, атрымлівае 3 балы, у мастацкай самадзейнасці факультэта — 2 балы. Сума балаў дзеліцца на колькасць студэнтаў у групе.

6. СТУДЭНЦКІ ПРАЦОЎНЫ РУХ

Члену студэнцкага будаўнічага атрада за ўдзел у працоўным семестры налічваецца 3 балы. Сума балаў дзеліцца на колькасць студэнтаў у групе.

***

Пры падвядзенні вынікаў камісія ўлічвае працоўную дысцыпліну як важнейшы фактар паспяховасці і актыўнасці.

### *Узнагароджанне пераможцаў*

Па выніках конкурсу вызначаюцца тры лепшыя групы універсітэта асобна на гуманітарных і прыродазнаўчых факультэтах. Для гэтага сумірующца ўсе балы, якія набраны студэнтамі па пунктах 1—6.

Пры прыкладнай роўнасці паказчыкаў рашаючую ролю ў вызначэнні пераможцаў адыгрывае паспяховасць.

Групы, якія зоймуць прызавыя месцы, узнагароджваюцца:

*Першы этап* — ільготнымі пуцёўкамі ў дамы адпачынку, студэнцкі прафілакторый, граматамі універсітэта.

*Другі этап:* I месца — паездкай па месцах, звязаных з жыццём і дзейнасцю У. І. Леніна,—Масква, Ленінград, Ульянаўск.

II месца — турысцкая паездка ў Брэсцкую крэпасць і Белавежскую пушчу.

III месца — паездка па маршруту Курган Славы — Хатынь.

Групы, заняўшыя I—III месцы, узнагароджваюцца граматамі універсітэта, прафкома, камітэта камсамола.

У прафком прадстаўляюцца наступныя матэрыялы аб лепшай групе:

1. Характарыстыка, завераная дэканам факультэта, старшынёй прафбюро і сакратаром камітэта камсамола.

2. Ведамасць паспяховасці студэнтаў.

3. Дакументы аб удзеле студэнтаў у навуковай рабоце, грамадскім жыцці, спорце, мастацкай самадзейнасці і працоўным семестры (персанальна аб кожным студэнце).

**ПРАФКОМ**
**КАМІТЭТ КАМСАМОЛА**

